Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01

DOI:10.17951/sb.2024.18.285-305
Studia Białorutenistyczne 18/2024 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Viktar Korbut

Independent researcher (Poland)
e-mail: v.korbut@uw.edu.pl
https://orcid.org/0000-0001-6848-1160

# Назвы месяцаў на старонках першых беларускіх газет „Наша Доля" і „Наша Нива"

*The Names of the Months in the First Belarusian Newspapers „Nasza Dola" and „Nasza Niwa"*

*Nazwy miesięcy na łamach pierwszych gazet białoruskich „Nasza Dola" i „Nasza Niwa"*

**Abstract**

The article discusses the process of creating the system of month names in the Belarusian language. The systematization of names and their selection began in the first year of publication in Vilna (Vilnius) since 1906 of the first Belarusian-language newspapers „Nasza Dola" and „Nasza Niwa". A possible source of words could be the *Dictionary of the Belarusian Dialect* compiled by Ivan Nosovich and published in 1870. The variability of lexemes is analysed on examples from „Nasza Niwa" of subsequent years (before 1915) and dialectal material of the 1920s. Attention is drawn to the incompleteness of the available dialectal material, the insufficient attention of scientists of the previous period to the names of months and the history of their functioning in the Belarusian language, which does not allow for a complete reconstruction of the process of creating their varieties both in Belarusian dialects, as well as in literary language.

**Keywords**: Belarusian language, identity, nation, dialectology, calendar, „Nasza Dola", „Nasza Niwa"

**Abstrakt**

W artykule został omówiony proces tworzenia systemu nazw miesięcy w języku białoruskim. Początkiem systematyzacji nazw i ich selekcji był pierwszy rok ukazania się w Wilnie (od 1906 r.) pierwszych białoruskojęzycznych gazet „Nasza Dola" i „Nasza Niwa" („Naša Niwa"). Ewentualnym źródłem poszczególnych wyrazów mógł być *Słownik gwary*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



*białoruskiej* opracowany przez Iwana Nosowicza i wydany w 1870 r. Zmienność leksemów analizowana jest na przykładach z „Naszaj Niwy" z kolejnych lat (do 1915 r.) oraz materiału dialektalnego z lat 20. XX w. Zwraca się uwagę na niekompletność dostępnego materiału gwarowego, niedostateczną uwagę naukowców wcześniejszego okresu w stosunku do nazw miesięcy i historii ich funkcjonowania w języku białoruskim, co nie pozwala na całkowite odtworzenie procesu powstawania ich form, wariantów zarówno w gwarach białoruskich, jak i w języku literackim.

**Słowa kluczowe**: język białoruski, tożsamość, naród, dialektologia, kalendarz, „Nasza Dola", „Nasza Niwa"

**Анатацыя**

У артыкуле разглядаецца працэс складвання сістэмы назваў месяцаў у беларускай мове. За пачатак сістэматызацыі назваў, іх адбору ўзяты першы год выдання першых беларускамоўных газет „Наша Доля" і „Наша Нива" („Наша Ніва"), якія выходзілі ў Вільні з 1906 г. Выказваецца меркаванне, што адной з крыніц назваў месяцаў мог быць *Словарь бѣлорусскаго нарѣчія*, складзены Іванам Насовічам і выдадзены ў 1870 г. Аналізуецца варыянтнасць лексем з прыцягненнем прыкладаў з „Нашай Нива" наступных гадоў (да 1915 г.) і дыялектнага матэрыялу 1920-х гг. Адзначаецца непаўната даступнага дыялектнага матэрыялу з-за недастатковай увагі вучоных у папярэдні перыяд да назваў месяцаў і гісторыі іх функцыянавання ў беларускай мове, што робіць немагчымым поўную рэканструкцыю іх форм, варыянтаў як у беларускай дыялектнай, так і ў літаратурнай мове.

**Ключавыя словы**: беларуская мова, ідэнтычнасць, нацыя, дыялекталогія, каляндар, „Наша Доля", „Наша Нива"

## Уводзіны

1(14) верасня 1906 г. у Вільні, дзе ў той час склаўся адзін з вядучых цэнтраў сацыялістычнай плыні беларускага нацыянальнага руху, па ініцыятыве лідара гэтай плыні і, адпаведна, партыі Беларуская сацыялістычная грамада – Яна Луцкевіча выйшла першая беларускамоўная легальная газета „Наша Доля" („Nasza Dola") (далей – „НД" („ND")). Яе апошні нумар убачыў свет 1 снежня 1906 г. У той час ужо выходзіла, таксама па ініцыятыве Я. Луцкевіча, другая беларускамоўная газета „Наша Нива" („Nasza Niwa"; пазней – „Наша Ніва" („Naša Niwa"))[1] (далей – „НН" („NN")) – з 10 (23) лістапада 1906 г. (да 1915 г.) (Sèrbènta, 1932; Aleksandrovìč, 1968; Unučak, 2008; Korbut, 2023b, 2023c).

[1] Выкарыстоўваюцца арыгінальныя формы назваў выданняў у 1906–1907 гг.: «Наша Доля. Першая белоруская газэта для вёсковаго и местоваго рабочаго народу. Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами»; «Наша Доля. Першая беларуская газета для весковаго и местоваго рабочаго народа. Выходзиць раз у тыдзень русскими и польскими

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



Першы год выдання абедзвюх газет невыпадкова супаў з падзеямі рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Расійскай імперыі, якая стала перыядам пэўнай лібералізацыі палітыкі ўлад у нацыянальным пытанні.

„НД" і „НН" самі сябе называлі „першыми беларускими газэтами", што было заканамерна, бо іх заснавальнікі не бачылі ў мінулым папярэднікаў.

Выдаўцы, рэдактары і аўтары газет сцвярджалі на беларускай мове ідэю аб самастойнасці і адметнасці беларускай нацыі і распаўсюджвалі яе сярод усіх беларусаў – і католікаў („палякаў") і праваслаўных („рускіх"), яднаючы іх такім чынам у адну *беларускую нацыю*.

Яркім маркерам, які сведчыць пра складанасць працэсу фарміравання беларускай нацыі, яе ідэнтычнасці і літаратурнай, або агульнай (у першую чаргу газетнай) мовы ў гэты перыяд, з'яўляюцца, у прыватнасці, назвы месяцаў, якія выкарыстоўваліся на старонках „НД" і „НН". 1906–1907 гг., перыяд станаўлення першых беларускіх газет, быў пачаткам дастаткова працяглага працэсу нармалізацыі сістэмы назваў месяцаў у беларускай літаратурнай мове.

Паколькі пытанне аб фарміраванні нацыянальнай сістэмы каляндарных назваў з'яўляецца адным з ключавых у гісторыі беларускай літаратурнай мовы, яму ў навуцы дагэтуль надавалася пэўная ўвага, але не вычарпальная. Што датычыць „НД", то яе змест пад гэтым вуглом не аналізаваўся зусім. „НН" разглядалася мовазнаўцамі ў гэтым кантэксце (Kramko, Ûrèvìč, Ânovìč, 1963, s. 138–139; Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 223–225; Prenner, 2016, s. 210–222; Prenner, 2018, s. 240–242), але не ва ўсіх дэталях.

Варта адзначыць, што ў (старабела)рускай мове назвы месяцаў былі прадстаўлены перш за ўсё лексемамі лацінскага паходжання (тут і далей яны абазначаюцца лацінскімі лічбамі – ад I да XII), параўн.: *февруара* > **февруаръ, февруарія* > **февруарій, февруарія* > **февруарій* 'II', *секстиль* 'VIII', *септемберъ* 'IX', *октоберъ* 'X', *новемберъ* 'XI', *дэцэмбръ* 'XII', а таксама польскага, параўн.: *стычня* > **стычень* 'I', *лютаго* > **лютый* 'II', *кветень, кветня* 'IV', *червца* > **червецъ* 'VI', *серпень* 'VIII', *вресень, во вресню; врешня* > **врешень* 'IX', *паздерникъ, паздерника* 'X', *кгрудень, кгрудня; грудня* > **грудень* 'XII', і нямецкага, параўн.: *марецъ* 'III' (хаця першакрыніцай слова з'яўляецца лацінская мова, а запазычванне адбывалася з польскай) (Bulyka, 1972, s. 69, 145, 152, 197, 234, 297, 310, 336; Bulyka, 1980, s. 156–157). Зрэшты, у „Леξиконѣ

литэрами»; „Nasza Dola. Pierszaja biełaruskaja hazeta dla wioskowaho i miestowaho raboczaho narodu. Wychodzić raz u tydzień polskimi i ruskimi literami"; «Наша Нива. Першая беларуская газэта з рысунками. Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами»; „Nasza Niwa. Pierszaja biełaruskaja hazeta z rysunkami. Wychodzić raz u tydzień polskimi i ruskimi literami". Тое ж датычыць пазнейшага перыяду. У цытатах з прац іншых даследчыкаў захоўваюцца тыя формы назваў газет, якія імі выкарыстаны. Таксама выкарыстоўваюцца арыгінальныя назвы іншых выданняў, захоўваюцца асаблівасці правапісу крыніц.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



славенорωсскомъ" (Кіеў, 1632 г.) Памвы Бярынды адзначана як адпаведнік польскага слова *червецъ* лексема *червень* з сінонімам *червлень* (Bulyka, 1972, s. 356), аднак гэту лексему, магчыма, варта разглядаць у кантэксце больш шырокіх (старабела)руска-польскіх сувязей, а менавіта, з улікам стараўкраінскага матэрыялу.

Паколькі пераемнасць паміж беларускай літаратурнай мовай пачатку XX ст. і (старабела)рускай пісьменнасцю не назіраецца (калі не лічыць асобных з'яў) (Žuraŭskì, Kramko, 1972, s. 144; Lemcûgova, 2005, s. 14–20), то на старонках першых беларускіх газет „адбывалася выпрацоўка беларускіх назваў месяцаў, дзе праявілася і сувязь з рускімі і польскімі назвамі, і імкненне выпрацаваць свае, адметныя назвы, апіраючыся на жывую народную моўную стыхію" (Kramko, Ûrèvìč, Ânovìč, 1963, s. 138).

Пытанні паходжання і этымалогіі беларускіх назваў месяцаў больш прадметна разгледжаны ў іншых даследаваннях (Bulyka, 1980, s. 156–157; Prenner, s. 2016, 210–222), таму ў гэтай працы мы засяродзімся на лексічнай і правапіснай варыянтнасці ў 1906–1907 гг. У гэты перыяд на старонках газет „НД" і „НН" можна вылучыць „паказальныя прыклады" працэсу фарміравання ўласнабеларускай сістэмы назваў месяцаў праз пераходную стадыю іх „сінанімічных радоў" (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 223).

Аналіз прапанаванай для разгляду лексікі зроблены з выкарыстаннем наступных метадаў даследавання: лінгвістычнага апісання, рэтраспектыўнага метаду рэканструкцыі лексікі мяжы XIX – XX стст., статыстычнага метаду аналізу шырокага матэрыялу з газет і інш. Для аналізу выкарыстаны ўсе нумары „НД" за 1906 г., усе нумары „НН" за 1906–1907 гг., а таксама матэрыялы па нумарах да 1915 г., апрацаваныя і выдадзеныя іншымі даследчыкамі (Lemcûgova, 2003–2019; Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 163–265; Prenner, 2016). Газеты выходзілі штотыдзень рэгулярна, за выключэннем „НД", якая канфіскоўвалася і прыпыняла выхад (Korbut, 2023c, c. 101–141).

## Варыянты назваў месяцаў на старонках „Нашай Долі" і „Нашай Нівы"

Ніжэй перад двукроп'ем прыводзяцца праўдападобныя зыходныя (беларускія (дыялектныя), рускія, польскія) формы назваў месяцаў, з якіх былі ўтвораны газетныя беларускамоўныя формы, якія цытуюцца дакладна паводле арыгінальнай арфаграфіі (прыклады з „НД" выдзелены патоўшчаным шрыфтам).

**I:**

рус. *январь* і пол. *styczeń*: *января (стычня)* (НН, 1906, 7); *janwara (stycznia)* (NN, 1907, 1, 5); *u styczniu (janwary)* (NN, 1907, 8); *8 stycznia (janwara)* (NN, 1907, 35);

рус. *январь*: *9 janwara* (NN, 1907, 3); *janwarskaja knižka* (NN, 1907, 11);

пол. *styczeń*: *da 1 stycznia 1907 hodu* (NN, 1907, 21);

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



бел. *студзень* і рус. *январь*: *25 studnia (janwara*) (NN, 1907, 7).

У „НН” назва I месяца года атрымала наступнае развіццё:
1908 г. – *stycznia*; 1909 г. – *janwara / января*; 1910–1912 гг. – *studnia (janwara) / студня (января)*; 1913–1915 гг. – *студня* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 223–224; Prenner, 2016, s. 211–212; Prenner, 2018, s. 241).

Аўстрыйская беларусістка Марыя Катажына Прэнэр піша, што „НН”
w latach 1907 i 1908 [...] używała nazwy miesięcy w dopełniaczu na podstawie języka rosyjskiego, *января*, oraz na podstawie języka polskiego, czyli *stycznia*. [...] Od 1910 do 1912 roku w obu wydaniach pojawia się własna nazwa białoruska, mianowicie *studzień – studnia / студня*, która była uzupełniana rosyjskim odpowiednikiem w nawiasach (Prenner, 2018, s. 241).

Аднак з прыведзеных прыкладаў вынікае, што форма *студня* (р. скл.) была ўжыта ўпершыню яшчэ ў сёмым нумары „НН” за 1907 г.

**II:**

рус. *февраль* і пол. *luty*: *февраля (лютаго)* (НН, 1906, 6); *lutaho (fiewrala)* (NN, 1907, 5, 7); *15 fieйrala (lutaho)* (NN, 1907, 11);
пол. *luty* або бел. *люты*: *u lutym miesiacy* (NN, 1907, 1);
рус. *февраль*: *2-ho fieйrala*; *20 fiewrala* (NN, 1907, 10).

На старонках „НН” назва II месяца мела пазней наступныя формы:
1908 г. – *lutaho*; 1909 г. – *fiewrala (февраля)*; 1910–1912 гг. – *lutaho (fiewrala) / лютаго (февраля)*; 1913–1915 гг. – *лютаго* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 225; Prenner, 2016, s. 212).

**III:**

пол. *marzec*: *2 (15) marca* (NN, 1907, 8); *S pierszaho marca* (NN, 1907, 10); *jeszcze ŭ pałowi marca* (NN, 1907, 15); *Ŭ marcy miesiacy* (NN, 1907, 16).

У „НН” III месяц пазней называўся:
1908–1909 гг. – *marca / марца*; 1910–1912 гг. – *sakawika (marca) / сакавіка (марца)*; 1913–1915 гг. – *марца*. Адзначана з'яўленне ў 1908 і 1910 гг. формы *marta / марта*, у 1910 г. – *сокавік* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 223, 225; Prenner, 2016, s. 213–214; Prenner, 2018, s. 241–242).

**IV:**

рус. *апрель*: *18 aprela* (NN, 1907, 5, 12); *u apreli miesiacy* (NN, 1907, 10);
пол. (уст.) *apryl*: *(6) 19 apryla* (NN, 1907, 14).

На старонках „НН” назва IV месяца года адзначана таксама ў гэткіх варыянтах:
1908 г. – *apryla / апрыля*; 1909 г. – *aprela*; *apryla / апрэля*; *апрыля*; 1910–1912 гг. – *krasawika (aprela) / красавіка (апрэля)*; *красавіка (апрыля)*; 1913–1915 гг. – *красавіка* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 223–225; Prenner, 2016, s. 214).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



**V:**

рус. *май* і пол. *maj*: *da 1-ho maja* (NN, 1907, 16); *ŭ pałowi maja* (NN, 1907, 20).

Назва V месяца года ў „НН" вагалася:
1908–1909 гг. – *maja / maja*; 1910 г. – *trawienia (maja) / травеня (мая)*; *травня*; *траўня*; *трауня*; 1911 г. – *trawnia (maja) / травня (мая)*; 1912 г. – *traŭnia (maja) / трауня (мая)*; *мая*; 1913–1915 гг. – *мая* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 224–225; Prenner, 2016, s. 215).

**VI:**

рус. *июнь*: *junia* (NN, 1907, 21, 22, 31);
бел. *чэрвень* і рус. *июнь*: *8 (21) czerwienia (junia)* (NN, 1907, 22); *Za juń (czerwień)* (NN, 1907, 25).

На старонках „НН" назва VI месяца года доўгі час мела розныя формы:
1908 г. – *czerwienia / июня*; 1909 г. – *junia / юня*; 1910 г. – *čerwienia (junia) / чэрвеня (юня)*; 1911 г. – *čerwienia / чэрвеня*; 1912 г. – *čerwienia (junia) / чэрвеня (іюня)*; 1913–1915 гг. – *чэрвеня* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 224–225; Prenner, 2016, s. 216).

**VII:**

бел. *лiпень* і рус. *июль*: ***липеня (юля)*** = ***lipienia (juli)*** [sic!]; ***iюля (липеня)*** = ***jula (lipnia)*** (НД, 1906, 1; ND, 1906, 1); *27 jula (lipnia)*; *27 jula (lipienia)* (NN, 1907, 26);
бел. *лiпень*: *da 1-ho lipnia* (NN, 1907, 26);
рус. *июль*: *ciahnie na sud 30 jula* (NN, 1907, 26); *1-e jula ŭ Rasiei* (NN, 1907, 29);
пол. *lipiec*: *6 (19) lipca 1907 r*. (NN, 1907, 24).

На старонках „НН" назва VII месяца года атрымала наступнае развіццё:
1908 г. – *lipnia; липня (юля)*; 1909–1910 г. – *lipnia (jula) / ліпня (юля)*; 1911–1912 гг. – *lipnia (jula) / ліпня (юля)*; 1910–1912 гг. – *жыцень*; 1913–1915 гг. – *ліпня* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 224–225; Prenner, 2016, s. 217; Prenner, 2018, s. 242).

**VIII:**

рус. *август* і пол. *sierpień*: *6 aŭgusta (sierpnia)* (NN, 1907, 27); *10 аўгуста (серпня)* (NN, 1907, 28);
рус. *август*: ***awhusta*** = ***августа*** (ND, 1906, 1; НД, 1906, 1); *з* ***аугуста*** (НД, 1906, 6); *19 aйhusta ŭ Minsku* (NN, 1907, 29); *ŭ miesiacy aйhuście* (NN, 1907, 31);
пол. *sierpień*: *17 (30) sierpienia* (NN, 1907, 27); *31 серпня 1907 г.* (НН, 1907, 28).

У „НН" VIII месяц года пазней быў прадстаўлены лексемамі:
1908 г. – *sierpnia*; 1909 г. – *aйhusta / аўгуста*; 1910 г. – *sierpnia (awhusta); auhusta / серпня (августа); аугуста;* 1911 г. – *aūhusta / аугуста;* 1912 г. – *žniūnia (aūhusta) / жніўня (аўгуста)*; *жніуня (аугуста)*; 1913–1915 гг. – *жніуня* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 225; Prenner, 2016, s. 218; Prenner, 2018, s. 242).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



**IX:**

бел. *верасень* і рус. *сентябрь*: *sienciabra (wiereśnia)* (NN, 1907, 30, 33);
рус. *сентябрь*: ***сенцябра*** = ***sienciabra*** (НД, 1906, 1; ND, 1906, 1); ***сенцября*** = ***sienciabra*** (НД, 1906, 1, 2; ND, 1906, 1, 2); ***сенцябра*** (НД, 1906, 6; НН, 1907, 28); *sienciabra* (NN, 1906, 2; 1907, 5, 22, 30); *19 sienciabria* (NN, 1907, 30).

Назва IX месяца года ў „НН” мела ў наступныя гады такія варыянты:
1908 г. – *sienciabra*; 1909 г. – *sienciabra / сеньтября*; *сеньцябра*; 1910 г. – *wieresnia (sientiabra) / вересня (сентября)*; *верэсьня*; 1911 г. – *sienciabra / сенцябра*; *wieresnia / верэсьня*; 1912 г. – *wiereśnia (sienciabra) / верэсьня (сенцябра)*; 1913–1914 гг. – *верэсьня* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 224–225; Prenner, 2018, s. 219).

**X:**

бел. *кастрычнік* і рус. *октябрь*: *Akciabra (Kostrycznika)* (NN, 1906, 1);
рус. *октябрь*: *у* ***акцябры*** = *и* ***akciabry*** (НД, 1906, 2; ND, 1906, 2); ***акцябра*** = ***akciabra*** (НД, 1906, 3; ND, 1906, 3); ***акцябра*** (НД, 1906, 6); *akciabra* (NN, 1906, 2; 1907, 1, 5, 27, 29, 31); *„partji 17 akciabra”*; *Partija „17 aktiabra”* (NN, 1907, 13); *ū tym že akciabry hetaho hoda* (NN, 1907, 33).

У „НН” назва X месяца адзначана пазней у наступных формах:
1908–1909 гг. – *akciabra / акцябра*; 1910 г. – *kastryčnika (aktiabra) / кастрычніка (октября)*; *у кастрычніку*; 1911 г. – *kastryčnika / кастрычніка*; 1912 г. – *kastryčnika (akciabra) / кастрычніка (акцябра)*; 1913–1914 гг. – *кастрычніка* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 224–225; Prenner, 2018, s. 220).

**XI:**

бел. *лістапад*: *listapada* (NN, 1907, 33, 35, 36);
бел. *лістапад* і рус. *ноябрь*: *listapada (nojabra)* (NN, 1906, 4);
пол. *listopad* і рус. *ноябрь*: *listopada (nojabra)* (NN, 1906, 1, 2); *листопада (ноября)* (НН, 1906, 3);
рус. *ноябрь*: ***najabra*** (ND, 1906, 5; NN, 1907, 22, 32, 35); ***наября*** (НД, 1906, 6); *23 (6) nojabra 1907 r.* (NN, 1907, 34); *10 najabria 1906 h.* (NN, 1907, 33); *U najabry* (NN, 1907, 29);
пол. *listopad*: *8 listopada sabrali schod* (NN, 1907, 34).

На старонках „НН” назва XI месяца года паступова стабілізавалася:
1908 г. – *najabra*; 1909 г. *najabra / наябра*; 1910 г. – *listapada*; *nojabra / лістапада (ноября)*; *лістапада (наябра)*; 1911 г. – *listapada / лістапада*; 1912–1914 гг. – *лістапада* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 224–225; Prenner, 2016, s. 221).

**XII:**

бел. *снежань* і рус. *декабрь*: *снежня (дзекабра)* (НН, 1906, 6); *dziekabra (snieżnia)* (NN, 1907, 1);

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



рус. *декабрь* і пол. *grudzień*: *грудня (дзекабра)* (НН, 1906, 3, 6); *22 hrudnia (dziekabra)* (NN, 1907, 35); *dziekabra (hrudnia)* (NN, 1907, 1); *u hrudniu (dziekabry)* (NN, 1906, 4);
рус. *декабрь*: ***дзекабра*** (НД, 1906, 6); *Z 11 dziekabra* (NN, 1907, 5);
пол. *grudzień*: *Hrudzienia* (NN, 1906, 4); *7 (20) hrudnia 1907 r.* (NN, 1907, 35).

У „НН" назва XII месяца года развівалася ў гэткім кірунку:
1908 г. – *hrudnia (dziekabra) / грудня*; 1909 г. – *dziekabra / дзекабра*; 1910 г. – *snieżnia (dziekabra); diekabra / сьнежня (декабра)*; 1911 г. – *snieżnia / сьнежня*; 1912–1914 гг. – *сьнежня* (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 224–225; Prenner, 2016, s. 222; Prenner, 2018, s. 242).

На старонках „НД" прадстаўлены толькі назвы VII – XII месяцаў, таму поўная карціна ўсяго календара на матэрыялах гэтага выдання не можа быць рэканструявана. Да таго ж, апрача VII месяца, для якога выкарыстоўваюцца дзве назвы – беларуская *липеня* (*lipienia*, *lipnia*) і запазычаная з рускай мовы *juli* (*юля*, *jula*, *іюля*), VII – XII месяцы прадстаўлены лексемамі, запазычанымі з рускай мовы: *awhusta* (*августа*, *з аугуста*; *сенцябра*, *сенцября*, *sienciabra*; *акцябра*, *akciabra*, *у акцябры*, *u akciabry*; *наябра*, *najabra*; *дзекабра*).

Усе формы назваў месяцаў, якія выкарыстоўваліся ў 1906–1907 гг. у першых беларускіх газетах, можна прадставіць у наступнай табліцы (з улікам сучасных назваў і форм, якія выкарыстоўваліся ў „НН" у 1912–1915 гг., г. зн. у перыяд адноснай стабілізацыі лексічных і арфаграфічных норм).

Табліца 1. Назвы месяцаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове, „Нашай Доли" (1906), „Нашай Ниве" (1906–1907) і „Нашай Ніве" (1912–1915)

| Сучасная беларуская літаратурная мова ў н. і р. скл. | „НН" (1912–1915) | „НД" (1906) і „НН" (1906–1907) | | |
|---|---|---|---|---|
| | | бел. | рус. > *бел.* | пол. > *бел.* |
| I (студзень, студзеня) | *студня; января* | *studnia* | январь > *января (janwara)* | styczeń > *стычня (stycznia)* |
| II (люты, лютага) | *лютаго; февраля* | *лютаго (lutaho)* | февраль > *февраля (fiewrala, fieŭrala)* | luty > *лютаго (lutaho)* |
| III (сакавік, сакавіка) | *сакавіка; марца* | | | marzec > *marca* |
| IV (красавік, красавіка) | *красавіка; апрэля, апрыля* | | апрель > *aprela* | apryl [уст.] > *apryla* |
| V (май, мая) | *трауня; мая* | | май > *maja* | maj > *maja* |
| VI (чэрвень, чэрвеня) | *чэрвеня; іюня, junia* | *czerwień, czerwienia* | июнь > *juń, junia* | |
| VII (ліпень, ліпеня) | *ліпня; жыцень;юля* | *липеня (lipienia, lipnia)* | июль > *іюля, юля (juli, jula)* | lipiec > *lipca* |

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| VIII (жнівень, жніўня) | *жніўня; аўгуста* | | август > *аўгуста, аугуста, августа (aŭgusta)* | sierpień > *серпня (sierpnia, sierpienia)* |
| IX (верасень, верасня) | *верэсьня; сенцябра* | *wiereśnia* | сентябрь > *сенцябра, сенцября (sienciabra, sienciabria)* | |
| X (кастрычнік, кастрычніка) | *кастрычніка; акцябра* | *kostrycznika* | октябрь > *akciabra* | |
| XI (лістапад, лістапада) | *лістапада* | *listapada* | ноябрь > *наябра (najabra, nojabra)* | listopad > *листопада (listopada)* |
| XII (снежань, снежня) | *сьнежня* | *снежня (snieżnia)* | декабрь > *дзекабра (dziekabra)* | grudzień > *грудня (hrudnia, hrudzienia)* |

Практыка сістэматычнага ўжывання назваў месяцаў у беларускай літаратурнай мове звязана менавіта са з’яўленнем перыядычнага друку на ёй. Адпаведна, узнікла аб’ектыўная патрэба фарміравання нацыянальнай сістэмы гэтых назваў. Яна не магла скласціся адразу: спачатку адбываўся ў многім стыхійны выбар тых або іншых назваў і іх форм, і гэты працэс расцягнуўся на гады.

Няцяжка заўважыць, што назвы месяцаў, якія выкарыстоўваліся ў „НД” і „НН”, – гэта ў значнай ступені запазычанні з рускай і польскай моў. З разгледжаных прыкладаў відаць, што на працягу 1906–1907 гг. у беларускамоўнай прэсе не было выкарыстана беларускіх назваў III–V, VIII месяцаў; рускай формы назвы III месяца; польскіх форм назваў IX–X месяцаў. Самабытнымі беларускімі назвамі месяцаў, якія не маюць аналагаў у польскай і рускай мовах, можна прызнаць толькі тры – I, X, XII: *studnia, kostrycznika, снежня (snieżnia)* (р. скл.). Пры гэтым нельга не адзначыць, што існуе меркаванне аб тым, што ў выніку ўплыву польскай мовы на беларускую, які праяўляўся не толькі ў прамым запазычванні, а і ў калькаванні, беларуская назва X месяца таксама можа быць паланізмам: бел. *кастрычнік* < *кастрыца* < слав. **kostrica*, пол. *październik* < *paździerz*, а таксама серб.-харв. дыял. *паздерник* < слав. **pazderьje* ‘адходы льну, які апрацоўваецца восенню’ (Labko, 1988, s. 298).

Такім чынам, назвы месяцаў у беларускамоўным друку перш за ўсё базаваліся на рускай, у другую чаргу – на польскай літаратурных мовах і ў апошнюю чаргу на беларускай дыялектнай аснове. Пры гэтым, беларускія назвы II, XI месяцаў супадаюць з польскімі, а VI, VII, IX этымалагічна звязаны з польскімі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



## *Словарь бѣлорусскаго наречія* Івана Насовіча як магчымая крыніца беларускіх дыялектных назваў месяцаў на старонках „Нашай Доли" і „Нашай Нивы"

Варта задацца пытаннем, адкуль паходзяць беларускія дыялектныя назвы месяцаў на старонках „НД" і „НН". Можа, з узусу супрацоўнікаў рэдакцый газет і іх аўтараў? Аднак многія з іх паходзілі з польскамоўнага асяроддзя (Алаіза Пашкевіч, Антон Лявіцкі і інш.), нават нарадзіліся не на беларускамоўнай тэрыторыі (напрыклад, фактычныя заснавальнікі і рэдактары газет Ян і Антон Луцкевічы), праўдападобна, беларуская мова не для ўсіх іх была родная (першая) (Ян Луцэвіч пачынаў пісаць па-польску) (Kazakevič, Asadčy, 2011, s. 87–114; Korbut, 2023a, s. 68–90). З другога боку, цяжка сказаць, з якіх дыялектаў беларускай мовы маглі паходзіць тыя або іншыя формы, хто менавіта з аўтараў і рэдактараў выкарыстоўваў тыя або іншыя лексемы.

Аднак, улічваючы, што дзеячы беларускага нацыянальнага руху гадаваліся на беларусазнаўчай літаратуры XIX ст., то крыніцамі папаўнення лексічнага складу беларускай мовы, як аўтарскай, так і газетнай, маглі быць фальклорныя зборнікі, слоўнікі.

Напрыклад, такой крыніцай мог быць *Словарь бѣлорусскаго наречія*, укладзены Іванам Насовічам і выдадзены ў 1870 г. (Nosovič, 1870). У ім сустракаюцца наступныя формы (словаўжыванне можна датаваць, кіруючыся часам збору матэрыялу, першай паловай – сярэдзінай XIX ст.; аднак у слоўніку не дадзена лакалізацыі паходжання той або іншай лексемы):

I – *сѣчень* [...]. *Старинное названіе мѣсяца Января* [...]. *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ* (s. 631);

II – *лютый* [...] *(рѣдко употр.)*; *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ* (s. 275, 631);

III – 1) *соковикъ*; 2) *стычень* [...]. *Мѣсяцъ Мартъ* [sic!]; 3) *Марецъ*; *въ Марцу*; *марцовый*; 4) *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ.* [...] *Березовикъ* (s. 280–281, 620, 631);

IV – 1) *красовикъ* [...] *(стар. назв. Мѣсяца Апрѣля или Квѣтня)*; 2) *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ.* [...] *Квѣцень"* (s. 252, 631);

V – *въ Маю* (s. 280);

VI – *червецъ* [...]. *(Старинное названіе мѣсяца Іюня)*; *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ* (s. 631, 697);

VII – *липецъ* [...] *стар. названіе мѣсяца Іюля, очень рѣдко употребляемое*; *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ* (s. 268–269, 631);

VIII – *серпень* [...]. *Древнее названіе мѣсяца Августа, и нынѣ употребляемое простолюдинами*; *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ* (s. 578, 631);

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



IX – *вресень* [...]. *(Время осени) мѣс. Сентябрь. Употребляется шляхтою*; *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ* (s. 70, 631);

X – *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ.* [...] *Паздзерникъ* (s. 631);

XI – *листопадъ* [...]. *Слово старинное, иногда и нынѣ употребляемое*; *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ* (s. 269, 631);

XII – 1) *грудзень* [...] *(рѣдко употр.)*; 2) *Простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ.* [...] *Студзень* (s. 122, 631).

Звяртае на сябе ўвагу, што І. Насовіч выкарыстоўваў назвы, якія з'явіліся на старонках „НН” у 1906–1907 гг. (*люты, Марецъ, въ Маю, липецъ, серпень, листопадъ, грудзень*), у т. л. у блізкай форме (*вресень*); у іншым значэнні (*стычень* ‘III’, *Студзень* ‘XII’; параўн. пол. *styczeń* ‘I’, суч. бел. *студзень* ‘I’); сустракаюцца ў „НН” пазней (*соковикъ, красовикъ*); не фігуруюць увогуле ў беларускіх газетах (*сѣчень, Березовикъ, Квѣцень, червецъ, Паздзерникъ*). У „НД” лексем, якія б супадалі з сабранымі І. Насовічам, не адзначана.

Нельга не дадаць, што значную частку агульных лексем са слоўніка І. Насовіча і першых беларускіх газет складаюць паланізмы. І. Насовіч, з аднаго боку, слова *серпень* ‘VIII’ адносіў да мовы „простолюдиновъ”, а *вресень* – да мовы шляхты, а ўвогуле, значную частку слоў – да старадаўніх або рэдкіх ва ўжытку (*лютый, красовикъ, червецъ, липецъ, серпень, листопадъ, грудзень*). У той жа час у іншым месцы слоўніка яго ўкладальнік пісаў, што „простолюдины большею частію употребляютъ древнія названія мѣсяцевъ”, прыводзячы ў парадку ад I да IV адпаведна наступныя лексемы: *Сѣчень*; *Лютый*; *Березовикъ* (націск на апошні склад); *Квѣцень*; і ад VI да XII: *Червецъ*; *Липецъ*; *Серпень*; *Вресень*; *Паздзерникъ*; *Листопадъ*; *Студзень* (Носовичъ, 1870, с. 631). Як бачым, І. Насовіч быў або непаслядоўны, або няўважлівы, напрыклад, характарызуючы тут *вресень* як назву ў мове „простолюдиновъ”. У (старабела)рускай мове адзначаны формы *вресень, врешень*, у стараўкраінскай мове – *вресень, вересень,* якія лічацца запазычаннямі з пол. *wrzesień* (Mìhnevìč, 1980, s. 85).

Як сведчаць даныя *Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы* (Mìhnevìč, 1980, s. 85; Kraŭčuk, 1985, s. 234; Labko, 1988, s. 297–298; Martynaŭ, 1989, s. 113; Lučyc-Fedarèc, 1990, s. 9; Avìlava, 2006, s. 294; Malʹko, 2008, s. 68–69, 235; Malʹko, 2010, s. 325), менавіта слоўнік І. Насовіча фіксуе самыя старыя (архаічныя) з запісаных дагэтуль дыялектных назваў месяцаў у беларускай мове. Гэта дае падставы меркаваць, што на старонках „НН” у 1906–1907 гг. і пазней, праўдападобна, выкарыстаны менавіта лексемы, занатаваныя І. Насовічам (калі яны супадаюць у слоўніку і газетах).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



Табліца 2. Назвы месяцаў, якія супадаюць у *Словарѣ бѣлорусскаго нарѣчія* Івана Насовіча (1870), „Нашай Ниве” (1906–1907) і „Нашай Ніве” (1912–1915), і ў сучаснай беларускай літаратурнай мове

| *Словарѣ бѣлорусскаго нарѣчія* Івана Насовіча (1870) | „НН” (1906–1907) | „НН” (1912–1915) | у сучаснай беларускай літаратурнай мове |
|---|---|---|---|
| *лютый* | *лютаго (lutaho)* | *лютаго* | *люты* |
| *Марецъ; соковикъ* | *marca* | *марца; сакавіка* | *сакавік* |
| *красовикъ* | | *красавіка* | *красавік* |
| *въ Маю* | *maja* | *мая* | *май* |
| *липецъ* | *lipca* | | |
| *серпень* | *сернпя (sierpienia, sierpnia)* | | |
| *вресень* | *wiereśnia* | *верэсьня* | *верасень* |
| *листопадъ* | *листопада (listopada, listapada)* | *лістапада* | *лістапад* |
| *грудзень* | *грудня (hrudnia, hrudzienia)* | | |

З выкладзеных у табліцы даных можна зрабіць вывад, што ў сучаснай беларускай мове замацаваліся чатыры назвы месяцаў, якія прыведзены І. Насовічам і сустракаюцца на старонках „НН” у 1906–1907 гг. (выдзелены ў табліцы патоўшчаным шрыфтам). К 1912–1915 гг. у „НН” замацаваліся яшчэ дзве назвы, што супадаюць з лексемамі, зафіксаванымі І. Насовічам.

## Да пытання аб паходжанні і распаўсюджанасці назваў месяцаў у беларускіх дыялектах

Між тым, вельмі цяжка адказаць на пытанне, якія яшчэ назвы месяцаў маглі функцыянаваць у беларускай дыялектнай мове, але не былі зафіксаваны І. Насовічам. Цікава, аднак, адзначыць, што, напрыклад, у рускамоўным (з беларусізмамі) пісьме ад 1957 г. (у арыгінале дзве даты: *20* ***октября***; *21 XI* [sic!] *57*) прадзеда аўтара – шляхціца паводле паходжання Аляксандра Стэфанавіча Корбута, які нарадзіўся ў 1881 г. і жыў у в. Квасынічы сучаснага Слуцкага раёна, выкарыстана лексема *кастрычника* (р. скл.) у наступным кантэксце: *21-го* ***окт.*** *баба поеде у Новыя сады* [?] *есть там баба то може что привезе какое. что она дасть то быть может придется приехать раньше* ***кастрычника***. У сувязі з тым, што ў лісце прысутнічае назва месяца *октября* (р. скл.), якая храналагічна (у цяперашнім часе) папярэднічае слову *кастрычника*, якое ўжыта ў будучым часе, – гэта дазваляе выказаць меркаванне аб магчымым значэнні апошняга ‘XI’. І хаця ў І. Насовіча слова **кастрычникъ* не адзначана, з’яўленне лексемы

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



ў першым нумары „НН” за 1906 г. – *19 Akciabra (Kostrycznika)* („Oko”, 1906, s. 6), падмацаванае прыкладам са шляхецкай гаворкі Слуцкага раёна, сведчыць пра паходжанне гэтай назвы з рэальнага беларускамоўнага ўзусу канца XIX – першай паловы XX ст. Праўда, у навуковай літаратуры выказвалася меркаванне аб тым, што *кастрычнік* з'яўляецца калькай пол. *październik* (Labko, 1988, s. 297–298), аднак аналіз этымалогіі і семантыкі данага слова выходзіць па-за рамкі гэтага даследавання.

Пошукі ў дыялектах крыніц лексем, якія абазначаюць назвы месяцаў на старонках першых беларускіх газет, можна пашырыць за кошт т.зв. краёвых слоўнікаў, падрыхтаваных беларускімі мовазнаўцамі ў сярэдзіне – другой палове 1920-х гг. на падставе запісаў лексікі ад асоб, якія былі равеснікамі „НД” і „НН” на Віцебшчыне, Чэрвеньшчыне і ўсходняй Магілёўшчыне (Kas′pârovìč, 1927, s. 186; Šatèrnìk, 1929, s. 153, 155; Bâl′kevìč, 1970, s. 250, 255, 260, 494).

Натуральна, нельга сцвярджаць адназначна пра непасрэдную сувязь запісаных слоў з мовай газет, аднак варта звярнуць увагу на гэтыя крыніцы, якія дадаюць пэўныя дэталі да карціны фарміравання сістэмы агульнанацыянальных назваў месяцаў і іх вытокаў.

Табліца 3. Назвы месяцаў у „Нашай Доли” (1906), „Нашай Ниве” (1906–1907) і „Нашай Ніве” (1912–1915), і „краёвых” слоўніках другой паловы 1920-х гг.

| Назвы месяцаў у „НД” (1906) і „НН” (1906–1907) | Назвы месяцаў у „НН” (1912–1915) | Назвы месяцаў у „краёвых” слоўніках другой паловы 1920-х гг. |
|---|---|---|
| *лютаго (lutaho)* | *лютаго* | *лютый* [Мілаславічы, Клімавіцкі раён] |
| *marca* | *марца* | *марац* [Русінава, Сенненскі раён; в. Ста́рына, Смілавіцкі раён]; *маріц* [Мілаславічы, Клімавіцкі раён]; *у марыцы* [Буліна, Касцюковіцкі раён]; *у марыцэ*; *марцовый* [Пірагова, Мсціслаўскі раён] |
| *maja* | *мая* | *май* [в. Ста́рына, Смілавіцкі раён; Паходавічы, Чэрыкаўскі раён] |
| *czerwień; czerwienia* | *чэрвеня* | *чэрвіня* [Куляшоўка, Клімавіцкі раён] |
| *липеня (lipienia, lipnia)* | *ліпня* | *ліпеня* [Мсціслаў] |
| *kostrycznika* | *кастрычніка* | *Кастрычнікавую рывалюцыю* [Мсціслаў] |
| *листопада (listopada, listapada)* | *лістапада* | *лістыпад* [Вярбоўка, Раснянскі раён]; *у лістыпадзі* [Мсціслаў] |

У прыведзенай табліцы не ўсе лексемы могуць быць „народнымі”, уласна дыялектнымі. Думаецца, у выпадку прыкладаў, запісаных у Мсціславе, яны могуць паходзіць ад асоб, якія валодалі беларускай літаратурнай мовай. Пра гэта можа сведчыць запісаны выраз: *У лістыпадзі сьвяткуюць Кастрычнікавую рывалюцыю* – як па форме (гэта можа пацвярджаць тагачасная літаратурная норма,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



найбольш распаўсюджаная ў друку: *Кастрычнікавая рэвалюцыя (рэволюцыя)*[2]), так і па лозунгавасці зместу.

У сваю чаргу, беларускі мовазнавец Іосіф Воўк-Левановіч у 1920-я гг. лічыў, што „замест *студзень, люты, сакавік, красавік* і г. д. народ гаворыць: *январ, фяўраль* (*люты* – толькі ў прыказцы), *марац, апрэль* альбо *апраль, май, юнь, юль, аўгуст* і г. д.". Гэты погляд, здавалася б, падмацоўваецца ўзусам першых беларускіх газет 1906–1907 гг. Аднак І. Воўк-Левановіч (2010, s. 364) не ўдакладняе арэала распаўсюджання прыведзеных слоў і часу іх бытавання, у той жа час яго сведчанне кантрастуе з данымі, прыведзенымі І. Насовічам.

На жаль, адсутнасць матэрыялаў па назвах месяцаў у дыялекталагічных атласах, выдадзеных у другой палове XX ст. (Avanesaŭ, 1963a; Avanesaŭ, 1963b; Bìryla, 1994; Mackevìč, 1979–1986; Mackevìč, 1996; Mackevìč, 1998), збядняе той агульны фон, на якім можна было б разгледзець эвалюцыю форм тых або іншых лексем.

У сучасных беларускіх гаворках ваколіц Вільні дыялектолаг Міраслаў Янковяк адзначыў наступныя польскія паводле паходжання формы назваў месяцаў: *mažec, kviecień, červiec* (Jankowiak, 2022, s. 142), якіх у першых беларускіх газетах 1906–1907 гг. не зафіксавана, аднак *Марецъ, Квѣцень, червецъ* прыводзіць І. Насовіч, што схіляе да меркавання пра наяўнасць пэўнага гістарычнага пласта каляндарнай лексікі ў беларускіх дыялектах. Адкрытым застаецца пытанне аб храналогіі яе з'яўлення ў той ці іншай гаворцы.

Аднак нельга не ўлічваць магчымасці ўплыву на лексіку беларускай прэсы тых гаворак, якія маглі чуць або якімі маглі карыстацца яе рэдактары і аўтары. Так, напрыклад, вядома, што заснавальнікі і рэдактары „НД" і „НН" браты Антон і Ян Луцкевічы нарадзіліся ў Шаўлях (цяпер Шаўляй у Літве), жылі ў Лібаве (цяпер Ліепая ў Латвіі), затым у Мінску, але яшчэ прыкладна з канца 1880-х гг. бавілі час „у летку на вёсцы ў бабак у Вілейскім павеці (у ваколіцах Краснага)" (*Žyc'ce ì praca*, 1920, s. 5–7).

Вывучэнне лінгвагеаграфіі тэкстаў першых беларускіх газет магло б праліць святло на многія дагэтуль цьмяныя моманты ў гісторыі фарміравання сучаснай беларускай мовы, у тым ліку варыянтнасці ў ёй. У прыватнасці, звяртае на сябе ўвагу не толькі варыянтнасць лексем, у іх ліку назваў месяцаў, але і ваганні ў правапісе, параўн.: *listapada – listopada; сеньтябра – сеньцябра – сенцябра; вересня – верэсьня*, што не заўсёды было абумоўлена ўплывам дыялектаў беларускай мовы, а скарэй этымалагічным правапісам, запазычаным з польскай і рускай моў.

---

[2] Параўн.: *Лютаўская і Кастрычнікавая рэволюцыі* (Spadarožnìk pa Mensku, [1930], s. 57), але: *пасьля Кастрычніцкай рэволюцыі* (Рарой, 1931, s. 334).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



## Заключэнне

Праблема варыянтнасці назваў месяцаў, распаўсюджанасці тых або іншых форм у дыялектах і іх суадносін з лексемамі, якія замацаваліся ў літаратурнай мове, бадай, так і застанецца нявырашанай з-за недахопу крыніц. Як паказваюць апублікаваныя даныя (*Pragrama pa vyvučènnû...*, 1950; *Ìnstrukcyâ pa zbìrannû...*, 1959; Avanesaŭ, 1963a, 1963b), задача збору назваў месяцаў не стаяла перад дыялектолагамі падчас комплекснага абследавання тэрыторыі Беларусі ў 1950–1960-я гг., калі яшчэ можна было спаткаць сучаснікаў „НД" і „НН".

Увогуле, варта мець на ўвазе, што, магчыма, у сялянскім, у масе сваёй у пачатку ХХ ст. непісьменным беларускамоўным соцыуме (у сярэднім пісьменнасць сярод беларусаў у 1897 г. складала 13,5%) (Tereškovič, 2004, s. 115), быў малавядомы той каляндар з падзелам на дванаццаць месяцаў, якім карысталіся ў адукаваных слаях насельніцтва, з якімі мела кантакт сялянства, – г. зн. у асяроддзі шляхты, звязанай у той ці іншай ступені з польскай моўна-культурнай традыцыяй. Гэтым і можа тлумачыцца інфільтрацыя ў беларускамоўны ўзус польскіх лексем. І. Насовіч спецыяльна амаль не агаворваў лексікі запазычанай з польскай мовы (Zaprudskì, 2018, s. 29–31), аднак часам змяшчаў інфармацыю пра выкарыстанне пэўных слоў у мове шляхты. Тыя словы, якія ён адзначае як старадаўнія, відавочна, паходзяць з перыяду Рэчы Паспалітай. Аднак ад каго яны запісаны? Ад шляхты ці ад тых сялян, якія кантактавалі са шляхтаю? Гэта пытанне пакуль застаецца без адказу, аднак можа быць адной з гіпотэз.

Большасць жа сялян жылі паводле іншага календара – г. зв. земляробчага, у якім час дзяліўся на адрэзкі паміж рознымі рэлігійнымі святамі, звязанымі з абрадамі і прыроднымі з'явамі, якія мелі свае назвы: *Каляда, Шчадрэц, Куцця, Грамніцы, Масленіца* і г. д. (Gurskì, 1990).

У 1906–1913 гг. назіралася нестабільнасць у практыцы выкарыстання тых або іншых форм назваў месяцаў. Хаця выказвалася меркаванне пра тое, што „сінанімічныя рады з назвамі месяцаў к пачатку 1912 г. [...] распаліся" і быццам бы „засталіся ў мове газеты [„НН". – *В.К.*] толькі беларускія народныя назвы" (Anìsìm, Kryŭko, 2005, s. 225), варта ўдакладніць, што ў асноўных рысах сістэма назваў месяцаў сучаснай беларускай мовы склалася на старонках „НН" крыху пазней – к 1913–1915 гг. Што магло гэтаму паспрыяць, даследчыкі данага перыяду ў гісторыі газеты не тлумачаць. Можна толькі выказаць здагадку, што праца ў якасці фактычных рэдактараў „НН" побач з адным з заснавальнікаў газеты Антонам Луцкевічам – у 1909–1914 гг. у якасці сакратара газеты Вацлава Ластоўскага, вядомага сваімі пурыстычнымі поглядамі, а з 1914 г. у якасці афіцыйнага рэдактара – Яна Луцэвіча (Янкі Купалы), як выдатнага знаўца беларускай мовы, магла паспрыяць актывізацыі пэўных нармалізацыйных працэсаў унутры рэдакцыі выдання.

Аднак і пасля 1915 г. у беларускай літаратурнай мове назіралася вар'іраванне рада назваў. Так, пазней прапаноўваўся варыянт *сьцюдзень* замест *студзень*,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



вагалася словаўжыванне *май – травень, красавік – апрыль, чэрвень – чырвень*. Таксама гучала думка аб утварэнні прыметнікаў ад назваў месяцаў з асновай на *-нь-* без *-ь-* перад суфіксам *-ск-*: *студзенскі, травенскі, чэрвенскі, ліпенскі, жнівенскі, верасенскі, сьнежанскі* (Nazovy mesâcaŭ, 1943; Âŝčè raz pra nazovy, 1943). Усе падобнага роду прапановы кіраваліся прынцыпам адыходу ад „чужога ўплыву", аднак гэты прынцып яшчэ не быў уласцівы беларускаму друку 1906–1907 гг.

Гледзячы на праблематыку рэтраспектыўна, варта адзначыць выкарыстанне ў беларускай літаратурнай мове з 1912 г. і дагэтуль пары сінонімаў для V месяца: *май* (Lukašanec, 2012b, s. 19) – *травень*. Апошняе слова ў сучасных слоўніках памячаецца як устарэлае (Sudnìk, 1982, s. 502; Klyška, 1993, s. 172; Kryŭko, Sudnìk, 2002, s. 658; Lukašanec, 2012a, s. 730), аднак актыўна функцыянуе ў мове СМІ, мастацкай літаратуры і ў штодзённым маўленні, таму можна канстатаваць, што пачаты ў 1906 г. працэс фарміравання беларускай нацыянальнай нарматыўнай сістэмы назваў месяцаў яшчэ не завершаны. Пэўны разнабой назваў, які назіраўся ў пачатку XX ст. і часткова захаваўся ў пачатку XXI ст., можа сведчыць, абапіраючыся на крыніцы XIX ст., а таксама больш старажытныя, што ў арэале беларускай мовы адзінай сістэмы назваў месяца ніколі не існавала, а сучасная норма склалася ў выніку спалучэння элементаў з храналагічна і тыпалагічна розных крыніц, у т. л. шляхам запазычвання (перш за ўсё з польскай мовы).

Адпаведна, пытанне фарміравання сістэмы назваў месяцаў у беларускай літаратурнай і дыялектнай мовах патрабуе далейшых даследаванняў. А праведзены разгляд лексем на старонках „НД" і „НН" у 1906–1907 гг. у супастаўленні з данымі дыялекталогіі і гісторыі беларускай мовы ўносіць рад істотных акцэнтаў у веды па данай праблематыцы.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

### Sources / Źródła

ND (1906). – „Nasza Dola".

NN. (1906–1912). – „Nasza Niwa", „Naša Niwa".

НН. (1906–1915). – „Наша Нива", „Наша Ніва" [„Naša Niva", „Naša Nìva"].

НД. (1906). – „Наша Доля" [„Naša Dolâ"].

Avanesaŭ, Ruben, (red.) [i in.]. (1963a). *Dyâlektalagìčny atlas belaruskaj movy. Ustupnyâ artykuly, davedačnyâ matèryâly ì kamentaryì da kart*. Mìnsk: Vydavectva Akadèmìì navuk BSSR. [Аванесаў, Рубен, (рэд.) [і інш.]. (1963a). *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы. Уступныя артыкулы, даведачныя матэрыялы і каментарыі да карт*. Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук БССР].

Avanesaŭ, Ruben, (red.) [i in.]. (1963b). *Dyâlektalagìčny atlas belaruskaj movy*. Mìnsk: Vydavectva Akadèmìì navuk BSSR. [Аванесаў, Рубен, (рэд.) [і інш.]. (1963b). *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы*. Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук БССР].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



Avìlava, Valâncìna, (przyg.) [i in.]. (2006). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 11: *R–S*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Авілава, Валянціна, (укл.) [і інш.]. (2006). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 11: *Р–С*. Мінск: Беларуская навука].

Bâl′kevìč, Ìvan. (1970). *Kraëvy sloŭnìk ushodnâj Magìlëŭščyny*. Mìnsk: Vydavectva Navuka ì tèhnìka. [Бялькевіч, Іван. (1970). *Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны*. Мінск: Выдавецтва Навука і тэхніка].

Bìryla, Mìkalaj, (red.) [i in.]. (1994). *Leksìčny atlas belaruskìh narodnyh gavorak*. U 5 t., t. 2: *Sel'skaâ gaspadarka*. Mìnsk: Fond fundamental′nyh dasledavannâŭ Rèspublìkì Belarus′; Kamìtèt geadèzìì pry Savece Mìnìstraŭ Rèspublìkì Belarus′ [Бірыла, Мікалай, (рэд.) [і інш.]. (1994). *Лексічны атлас беларускіх народных гаворак*. У 5 т., т. 2: *Сельская гаспадарка*. Мінск: Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь; Камітэт геадэзіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь].

Kas′pârovìč, Mìkola. (1927). *Vìcebskì kraëvy sloŭnìk (matar`âly)*. Vìcebsk: Vydan′ne Vìcebskaga Akrugovaga Tavarystva Kraâznaŭstva ìvydavectva Zarâ Zapad”. [Касьпяровіч, Мікола. (1927). *Віцебскі краёвы слоўнік (матар’ялы)*. Віцебск: Выданьне Віцебскага Акруговага Таварыства Краязнаўства і выдавецтва Заря Запада].

Klyška, Mìhas′. (1993). *Sloŭnìk sìnonìmaŭ ì blìzkaznačnyh sloŭ*. Mìnsk: Vyšèjšaâ škola. [Клышка, Міхась. (1993). *Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў*. Мінск: Вышэйшая школа].

Kraŭčuk, R., (przyg.) [i in.]. (1985). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 3: *G–Ì*. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Краўчук, Р., (укл.) [і інш.]. (1985). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 3: *Г–І*. Мінск: Навука і тэхніка].

Kryŭko, Mìkalaj; Sudnìk, Mìhaìl, (red.). (2002). *Tlumačal'ny sloŭnìk belaruskaj lìtaraturnaj movy*, 3-e vyd. Mìnsk: Vydavectva Belaruskaâ Èncyklapedyâ ìmâ P. Broŭkì. [Крыўко, Мікалай; Суднік, Міхаіл, (рэд.). (2002). *Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы*, 3-е выд. Мінск: Выдавецтва Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі].

Labko, Valeryj, (przyg.) [i in.]. (1988). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 4: *K–Kaâta*. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Лабко, Валерый (укл.) [і інш.]. (1988). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 4: *К–Каята*. Мінск: Навука і тэхніка].

Lemcûgova, Valâncìna, (red.) [i in.]. (2003–2019). *Sloŭnìk movy „Našaj nìvy”. 1906–1915*, t. 1–4: *A–Â*. Mìnsk: Tèhnalogìâ. [Лемцюгова, Валянціна, (рэд.) [і інш.]. (2003–2019). *Слоўнік мовы „Нашай нівы”. 1906–1915*, т. 1–4: *А–Я*. Мінск: Тэхналогія].

Lučyc-Fedarèc, Ìvan, (przyg.) [i in.]. (1990). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 6: *L–M*. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Лучыц-Федарэц, Іван, (укл.) [і інш.]. (1990). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 6: *Л–М*. Мінск: Навука і тэхніка].

Lukašanec, Alâksandr, (rèd.). (2012a). *Belaruska-ruskì sloŭnìk = Belorussko-russkij slovar'*, t. 1: *A–Z*; vyd. 4-e, zmienione. Mìnsk: Belaruskaâ Èncyklapedyâ ìmâ P. Broŭkì. [Лукашанец, Аляксандр, (рэд.). (2012a). *Беларуска-рускі слоўнік = Белорусско-русский* словарь, т. 1: *А–З*; выд. 4-е, перапрац. і дап. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі].

Lukašanec, Aleksandr, (red.). (2012b). *Russko-belorusskij slovar' = Ruska-belaruskì sloŭnìk*, t. 3: *P–Â*, izd. 10-e pererab. i dop. Minsk: Belaruskaâ Èncyklapedyâ ìmâ P. Broŭkì. [Лукашанец, Александр, (ред.). (2012b). *Русско-белорусский словарь = Руска-беларускі слоўнік*, т. 3: *П–Я*, изд. 10-е перераб. и доп. Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі].

Mackevìč, Ûzèfa, (red.) [i in.]. (1979–1986). *Sloŭnìk belaruskìh gavorak paŭnočna-zahodnâj Belarusì ì âe pagranìčča*, t. 1–5: *A–Â*. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Мацкевіч, Юзэфа,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



(рэд.) [і інш.]. (1979–1986). *Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча*, т. 1–5: *А–Я*. Мінск: Навука і тэхніка].

Mackevìč, Ûzèfa, (red.) [i in.]. (1996). *Leksìčny atlas belaruskìh narodnyh gavorak*, t. 3: *Čalavek*. Mìnsk: Fond fundamental′nyh dasledavannâŭ Rèspublìkì Belarus′; Mìnìstèrstva arhìtèktury ì budaŭnìctva Rèspublìkì Belarus′. [Мацкевіч, Юзэфа, (рэд.) [і інш.]. (1996). *Лексічны атлас беларускіх народных гаворак*, т. 3: *Чалавек*. Мінск: Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь; Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь].

Mackevìč, Ûzèfa, (red.) [i in.]. (1998). *Leksìčny atlas belaruskìh narodnyh gavorak*, t. 5: *Semantyka. Slovaŭtvarènne. Nacìsk*. Mìnsk: Mìnìstèrstva fìnansaŭ Rèspublìkì Belarus′; Kamìtèt dzâržaŭnyh znakaŭ. [Мацкевіч, Юзэфа, (рэд.) [і інш.]. (1998). *Лексічны атлас беларускіх народных гаворак*, т. 5: *Семантыка. Словаўтварэнне. Націск*. Мінск: Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь; Камітэт дзяржаўных знакаў].

Mal′ko, Raìsa, (przyg.) [i in.]. (2008). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 12: *S*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Малько, Раіса, (укл.) [і інш.]. (2008). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 12: *С*. Мінск: Беларуская навука].

Mal′ko, Raìsa, (przyg.) [i in.]. (2010). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 13: *S–T*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Малько, Раіса, (укл.) [і інш.]. (2010). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 13: *С–Т*. Мінск: Беларуская навука].

Martynaŭ, Vìktar, (przyg.) [i in.]. (1989). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 5: *K–L*. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Мартынаў, Віктар, (укл.) [і інш.]. (1989). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 5: *К–Л*. Мінск: Навука і тэхніка].

Mìhnevìč, Arnol′d, (przyg.) [i in.]. (1980). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 2: *V*. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Міхневіч, Арнольд, (укл.) [і інш.]. (1980). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 2: *В*. Мінск: Навука і тэхніка].

Nosovič″, Ivan″, (zest.). (1870). *Slovar' bělorusskago narěčìâ*. Sanktpeterburg: Tipografìâ Imperatorskoj Akademìi Nauk. [Носовичъ, Иванъ, (сост.). (1870). *Словарь бѣлорусскаго нарѣчія*. Санктпетербургъ: Типографія Императорской Академіи Наукъ].

”Oko”. (1906). Z Mołodeczenskoj Wuczycielskoj Seminarji. *Nasza Niwa*, 1.

Sudnìk, Mìhaìl, (red.). (1982). *Tlumačal'ny sloŭnìk belaruskaj movy*, t. 5, kn. 1: *S–U*. Mìnsk: Vydavectva Belaruskaâ Saveckaâ Èncyklapedyâ” ìmâ P. Broŭkì. [Суднік, Міхаіл, (рэд.). (1982). *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*, т. 5, кн. 1: *С–У*. Мінск: Выдавецтва Беларуская Савецкая Энцыклапедыя” імя П. Броўкі].

Šatèrnìk, Mìkola, (ułoż.). (1929). *Kraëvy sloŭnìk Čèrvenščyny*. Mensk: Vydan′ne Belaruskae Akadèmìi Navuk. [Шатэрнік, Мікола, (улаж.). (1929). *Краёвы слоўнік Чэрвеншчыны*. Менск: Выданьне Беларускае Акадэміі Навук].

**Studies / Opracowania**

Aleksandrovìč, Scâpan. (1968). *Gìstoryâ ì sučasnasc'. Lìtaraturna-krytyčnyâ artykuly*. Mìnsk: Belarus′. [Александровіч, Сцяпан. (1968). *Гісторыя і сучаснасць. Літаратурна-крытычныя артыкулы*. Мінск: Беларусь].

Anìsìm, Alena; Kryŭko, Mìkalaj. (2005). Leksìčnaâ sìnanìmìâ. W: *Mova „Našaj Nìvy” (1906–1915). Varyântnasc'. Sìnanìmìâ* (s. 163–265). Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Анісім, Алена; Крыўко, Мікалай. (2005). Лексічная сінанімія. У: *Мова „Нашай Нівы” (1906–1915). Варыянтнасць. Сінанімія* (с. 163–265). Мінск: Беларуская навука].

Âščè raz pra nazovy mesâcaŭ. (1943). W: *Belaruskaâ gazèta*, 50. [Яшчэ раз пра назовы месяцаў. (1943). У: *Беларуская газэта*, 50].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



Bulyka, Alâksandr. (1972). *Daŭnìâ zapazyčannì belaruskaj movy.* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Булыка, Аляксандр. (1972). *Даўнія запазычанні беларускай мовы*. Мінск: Навука і тэхніка].

Bulyka, Alâksandr. (1980). *Leksìčnyâ zapazyčannì ŭ belaruskaj move XIV–XVIII stst.* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Булыка, Аляксандр. (1980). *Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст.* Мінск: Навука і тэхніка].

Gurskì, A., (przyg.). (1990). *Zemlârobčy kalândar (abrady ì zvyčaì).* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Гурскі, А., (укл.). (1990). *Земляробчы каляндар (абрады і звычаі)*. Мінск: Навука і тэхніка].

*Ìnstrukcyâ pa zbìrannû matèryâlaŭ dlâ skladannâ ablasnyh sloŭnkaŭ belaruskaj movy*. (1959). Mìnsk: Akadèmìâ navuk Belaruskaj SSR. [*Інструкцыя па збіранню матэрыялаў для складання абласных слоўнкаў беларускай мовы*. (1959). Мінск: Акадэмія навук Беларускай ССР].

Jankowiak, Mirosław. (2022). *Lexikum běloruských nářečí na Litvě. Jazykové dědictví balto--slovanského pomezí = Leksyka gwar białoruskich na Litwie. Dziedzictwo językowe pogranicza bałtycko-słowiańskiego*. Praha: Slovanský ústav AV ČR, v. v. i.

Kazakevìč, Andrèj; Asadčy, Andrèj. (2011). Pačac′ pìsac′ pa-belarusku. Règìânal′ny ì sacyâl′ny sklad belaruskaga adradžènnâ, kanec XIX – pačatak XX stagoddzâ. *Palìtyčnaâ sfera*, 1–2, s. 87–114. [Казакевіч, Андрэй; Асадчы, Андрэй. (2011). Пачаць пісаць па-беларуску. Рэгіянальны і сацыяльны склад беларускага адраджэння, канец XIX – пачатак XX стагоддзя. *Палітычная сфера*, 1–2, с. 87–114].

Korbut, Viktar. (2023a). Farmìravanne ìdèntyčnascì belaruskìh nacyânal′nyh dzeâčaŭ u 1890-h gg. – pačatku XX st.: ad pol′skaj da belaruskaj samasvâdomascì. [Корбут, Віктар. (2023a). Фарміраванне ідэнтычнасці беларускіх нацыянальных дзеячаў у 1890-х гг. – пачатку XX ст.: ад польскай да беларускай самасвядомасці]. W: *Wielokulturowość Europy Środkowo-Wschodniej: doświadczenia przeszłości i wyzwania teraźniejszości. Z okazji 20. rocznicy utworzenia Katedry Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej* (s. 68–90). Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego].

Korbut, Viktar. (2023b). Gìstaryâgrafìâ peršyh belaruskamoŭnyh gazet „Naša Dolâ” ì „Naša Niva”. [Корбут, Віктар. (2023b). Гістарыяграфія першых беларускамоўных газет „Наша Доля” і „Наша Нива”]. *Białoruskie Zeszyty Historyczne = Belaruskì gìstaryčny zbornìk*, 56, s. 131–220.

Korbut, Viktar. (2023c). Gìstoryâ peršaj belaruskaj gazety „Naša Dolâ”. [Гісторыя першай беларускай газеты „Наша Доля”]. *Przegląd Środkowo-Wschodni*, 8, s. 101–141.

Kramko, Ìvan; Ûrèvìč, Alena; Ânovìč, Alena. (1963). *Gìstoryâ belaruskaj lìtaraturnaj movy*, t. 2. Mìnsk: Vydavectva Navuka ì tèhnìka. [Крамко, Іван; Юрэвіч, Алена; Яновіч, Алена. (1963). *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы*, т. 2. Мінск: Выдавецтва Навука і тэхніка].

Lemcûgova, Valâncìna. (2005). Uvodzìny. W: *Mova „Našaj Nìvy” (1906–1915). Varyântnasc'. Sìnanìmìâ* (s. 5–33). Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Лемцюгова, Валянціна. (2005). Уводзіны. У: *Мова „Нашай Нівы” (1906–1915). Варыянтнасць. Сінанімія* (с. 5–33). Мінск: Беларуская навука].

Nazovy mesâcaŭ. (1943). *Belaruskaâ gazèta*, 32. [Назовы месяцаў. (1943). У: *Беларуская газэта*, 32].

Papoŭ, N. (1931). *Narys gìstoryì Ŭsesaûznaj Komunìstyčnaj Partyì (bal'šavìkoŭ)*, vyp. 1, per. z 12 ras. vyd. Mensk: Belaruskae Dzâržaŭnae Vydavectva. [Папоў, Н. (1931). *Нарыс гісторыі Ўсесаюзнай Комуністычнай Партыі (бальшавікоў)*, вып. 1, пер. з 12-га рас. выд. Менск: Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



*Pragrama pa vyvučènnû belaruskìh gavorak ì zbìrannû zvestak dlâ skladannâ Dyâlektalagìčnaga atlasa belaruskaj movy*. (1950). Mìnsk: Vydavectva Akadèmìì navuk Belaruskaj SSR. [*Праграма па вывучэнню беларускіх гаворак і збіранню звестак для складання Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы*. (1950). Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук Беларускай ССР].

Prenner, Maria Katarzyna. (2016). *Die Sprache der Zeitung Naša Niva im Zeitraum 1906–1915*, *Masterarbeit*. Wien: Universität Wien [maszynopis].

Prenner, Maria Katarzyna. (2018). „Naša Niva" na skrzyżowaniu kultur: dowody na różnych płaszczyznach języka gazety. *Acta Albaruthenica*, 18, s. 225–243.

Sèrbènta, Vìtal′, (rèd.). (1932). *Dyskusìâ ab „Našaj Nive"*. Mensk: Dzâržaǔnae Vydavectva Belarusi. Partsèktar. [Сэрбэнта, Віталь, (рэд.). (1932). *Дыскусія аб „Нашай Ніве"*. Менск: Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі. Партсэктар].

Spadarožnìk pa Mensku. (1930). W: P. Sârgejčyk. *1-aâ Ǔsebelaruskaâ vystaǔka sel'skaj gaspadarkì ì pramyslovas'cì (Âk trèba aglâdac' vystaǔku). Mensk. Stalìca B.S.S.R. Spadarožnìk (Spadarožnìk pa Mensku)* (s. 1–111). [Mensk]: Vydan′ne Mengarsavetu ì rèdakcyì gaz. „Rabočij". [Спадарожнік па Менску. (1930). У: П. Сяргейчык. *1-ая Ўсебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі і прамысловасьці (Як трэба аглядаць выстаўку). Менск. Сталіца Б.С.С.Р. Спадарожнік (Спадарожнік па Менску)* (с. 1–111). [Менск]: Выданьне Менгарсавету і рэдакцыі газ. „Рабочий"].

Tereškovič, Pavel. (2004). *Ètničeskaâ istoriâ Belarusi XIX – načala XX v. v kontekste Central'no-Vostočnoj Evropy*. Minsk: Belorusskij gosudarstvennyj universitet. [Терешкович, Павел. (2004). *Этническая история Беларуси XIX – начала XX в. в контексте Центрально-Восточной Европы*. Минск: Белорусский государственный университет].

Unučak, Andrèj. (2008). *„Naša nìva" ì belaruskì nacyânal'ny ruh (1906–1915)*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Унучак, Андрэй. (2008). *„Наша ніва" і беларускі нацыянальны рух (1906–1915)*. Мінск: Беларуская навука].

Voǔk-Levanovìč, Ìosìf. (2010). Pra nekatoryâ važnejšyâ nedahopy belaruskaj lìtaraturnaj movy. *Arche. Pačatak*, 11, s. 354–380. [Воўк-Левановіч, Іосіф. (2010). Пра некаторыя важнейшыя недахопы беларускай літаратурнай мовы. *Arche. Пачатак*, 11, с. 354–380].

Zaprudskì, Sârgej. (2018). Nekatoryâ aspekty vyvučènnâ lìngvìstyčnaj spadčyny Ìvana Nasovìča. *Rodnae slova*, 8, s. 29–31. [Запрудскі, Сяргей. (2018). Некаторыя аспекты вывучэння лінгвістычнай спадчыны Івана Насовіча. *Роднае слова*, 8, с. 29–31].

Žuraǔskì, Alâksandr; Kramko, Ìvan. (1972). Važnejšyâ adroznennì pamìž novaj ì staroj belaruskaj lìtaraturnaj movaj. W: *Belaruskae ì slavânskae movaznaǔstva: da 75-goddzâ akadèmìka AN BSSR K. K. Krapìvy* (s. 132–147). Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Жураўскі, Аляксандр; Крамко, Іван. (1972). Важнейшыя адрозненні паміж новай і старой беларускай літаратурнай мовай. У: *Беларускае і славянскае мовазнаўства: да 75-годдзя акадэміка АН БССР К. К. Крапівы* (с. 132–147). Мінск: Навука і тэхніка].

*Žyc'ce ì praca Ìvana Luckevìča* (1920). W: *Pamâcì Ìvana Luckevìča ǔ peršye ǔgodkì s'mercì âgo (20.VIII.1919–20.VIII.1920)*. Vìl′nâ. [*Жыцьце і праца Івана Луцкевіча.* (1920). У: *Памяці Івана Луцкевіча ў першые ўгодкі сьмерці яго (20.VIII.1919–20.VIII.1920)*. Вільня].

SUBMITTED: 2024.06.07
ACCEPTED: 2024.10.12
PUBLISHED ONLINE: 2025.01.08

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/04/2025 03:09:01



## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Viktar Korbut** – Polska, Warszawa; doktor nauk humanistycznych; *specjalność*: językoznawstwo; *zainteresowania naukowe*: historia białoruskiego języka literackiego; kształtowanie białoruskiej tożsamości narodowej; historia białoruskiego ruchu narodowego.

*Adres*: ul. Mała 1/2, 03-423 Warszawa, Polska

*Wybrane publikacje:*

1. Корбут, Віктар. (2020). Беларускае пытанне на старонках першых беларускіх газет „Наша Доля” („Nasza Dola”) і „Наша Нива” („Nasza Niwa”) (1906 г.). *Acta Polono-Ruthenica*, 25/3, s. 177–189.
2. Korbut, Viktar. (2021). Polskie wpływy i tematy na łamach pierwszych gazet białoruskich „Nasza Dola” i „Nasza Niwa” w latach 1906–1907. W: *Polacy na Białorusi od Powstania Styczniowego do XXI wieku*, t. V, *Traktat ryski i jego konsekwencje dla Polaków i Białorusinów* (s. 61–80). Warszawa: Studium Europy Wschodniej Uniwersytetu Warszawskiego.
3. Корбут, Віктар. (2021). Абазначэнне гука [ў] у першых беларускіх газетах „Наша Доля” („Nasza Dola”) і „Наша Нива” („Nasza Niwa”) у 1906 – пачатку 1907 г. У: *Матэрыялы XVII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў. Мінск, 22–23 красавіка 2021 г.* (с. 185–189). Мінск: Нацыянальная бібліятэка Беларусі.
4. Корбут, Віктар. (2021). Адлюстраванне месца і ролі беларускай мовы ў сістэме адукацыі як фактару фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці ў публіцыстыцы газеты „Nasza Niwa” („Наша Нива”) у 1906–1907 гадах. W: *Tożsamość białoruska: doświadczenia przeszłości i wyzwania teraźniejszości. W 30. rocznicę uzyskania przez Białoruś niepodległości* (s. 56–74). Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego.
5. Корбут, Віктар. (2023). Фарміраванне „нацыянальнага ўзору” тапаніміі на старонках першых беларускамоўных газет „Наша Доля” і „Наша Нива” (1906–1907 гг.). У: *Спазнаючы Беларусь... Да 65-годдзя беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта = Odkrywając Białoruś... 65-lecie białorutenistyki na Uniwersytecie Warszawskim = Discovering Belarus... On the Occasion of the 65th Anniversary of Belarusian Studies at the University of Warsaw* (s. 243–267). Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego.